# СПАДЧЫНА ТЫШКЕВІЧАЎ

А. І. СМОЛІК

## ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ І НАВУКОВА-ТВОРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ТЫШКЕВІЧАЎ У БЕЛАРУСІ І ЗАМЕЖЖЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прадстаўнікі графскага роду Тышкевічаў займалі ў XVI–XVIII стст. высокія дзяржаўна-адміністрацыйныя і вайсковыя пасады. Яны былі ўласнікамі вялікіх маёнткаў у Беларусі, на Украіне і ў Літве. Ужо ў XV ст. іх родапачынальніку Каленіку Мішкавічу вялікі князь падарыў шэраг сёл у Жытомірскім, Оўруцкім паветах (Украіна). З маёнтка Чарталесы, што належаў Мішкавічу, пазней узнік горад Бярдзічаў. Ён і Лагойскае графства сталі непадзельнымі маёнткамі (маяратамі). Тышкевічы набылі Лагойск, які стаў галоўным цэнтрам іх уладанняў у Беларусі, у першай палове XVI ст.

Пачынаючы з сына Каленіка Мішкавіча Тышкі (Цімафея) і пайшла назва графскага роду. Тытул графа «на Лагойску і Бярдзічаве» атрымаў Васіль Тышкевіч у 1569 г. ад караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста. Ён у гэты час займаў высокую дзяржаўную пасаду *ваяводы* смаленскага.

Ваявода ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай з'яўляўся кіраўніком мясцовай адміністрацыі. Ён быў абраны пажыццёва з ліку буйных феадалаў, абавязкова ўраджэнцаў ВКЛ, са згоды мясцовых феадалаў. Меў шэраг прывілеяў: засядаў у радзе ВКЛ і ў сенаце Рэчы Паспалітай, адстойваў інтарэсы мясцовай знаці, быў незалежны ад цэнтральных дзяржаўных органаў і інш. Ваявода ажыццяўляў кантроль над крыніцамі дзяржаўных і вялікакняскіх даходаў, выконваў судовыя функцыі ў замкавым судзе, займаўся арганізацыяй узброеных сіл на тэрыторыі ваяводства. У розныя гістарычныя перыяды ў склад Смаленскага ваяводства ўваходзілі гарады Копысь, Лучын, Мсціслаў.

Пасады ваявод у пэўныя часы займалі і прадстаўнікі графскага роду. Так, сын Васіля Тышкевіча – Юрый – быў ваяводам

брэсцкім; сын Юрыя – Пётр – мінскім; Міхал Ян Тышкевіч – віцебскім.

Вельмі ганаровай дзяржаўнай асобай у ВКЛ быў *падчашы*, гэтую пасаду мелі права займаць толькі прадстаўнікі магнацкіх родаў. Ён падаваў вялікаму князю напоі, папярэдне пакаштаваўшы іх сам. У XVII ст. падчашым быў Казімір Тышкевіч.

Асобныя тышкевіцкія магнаты былі і *падстоліямі*. У абавязкі Эмануэля Уладзіслава Тышкевіча, падстоллі брэсцкага, уваходзіла дапамога стольніку сервіраваць вялікакняскі стол.

Шэраг вельмі важных і адказных функцый у ВКЛ ускладзена на *пісара вялікага літоўскага,* які кіраваў справаводствам канцылярыі ВКЛ, быў дакладчыкам канцлера і вялікага князя. Ён фіксаваў і ўстанаўліваў вялікакняскія даходы і выдаткоўваў некаторыя з іх. У яго распараджэнні знаходзіліся капійныя кнігі канцылярыі, так званая Метрыка ВКЛ. Адначасова пісар быў і падскарбіем земскім. Нярэдка пісар выконваў важныя дыпламатычныя даручэнні. Гэтую высокую пасаду ў 1780-я гг. займаў Вінцэнт Тышкевіч. Дарэчы, на дыпламатычнай службе ў XVI ст. знаходзіўся і Юрый Васілевіч Тышкевіч. У 1552 г. ён ездзіў паслом у Крымскае ханства, у 1554 г. – у Маскву.

У пэўныя часы графу Вінцэнту даводзілася выконваць абавязкі і *рэферэндара,* які выслухоўваў скаргі прыватных асоб і паведамляў іх змест канцлеру, а той пераказваў іх каралю. Рэферэндар таксама абвяшчаў рашэнні манарха на пададзеныя просьбы і скаргі. Ён быў абавязаны пастаянна знаходзіцца пры манарху і даваць яму парады. Рэферэндар засядаў у рэляцыйным судзе, дзе разглядаліся інфлянцкія і курляндскія справы.

Значнымі службовымі асобамі ў ВКЛ з’яўляліся *старасты,* намеснікі вялікага князя ў адміністрацыйнай акрузе (старостве ці павеце). Староствай у ВКЛ называўся дзяржаўны маёнтак, які атрымліваў магнат у часовае карыстанне і кіраванне ў якасці ўзнагароды за важныя паслугі вялікаму князю або дзяржаве. У сваёй акрузе стараста цалкам ажыццяўляў дзяржаўную і судовую ўладу. Старастамі ў XVIII ст. былі Міхал Ян і Феліцыян Тышкевічы.

Пачэснай і адначасова адказнай у ВКЛ была пасада *маршалка павятовага,* якая ўзнікла падчас правядзення ў XVI ст. адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы. У адпаведнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з ёй у ВКЛ ствараліся павятовыя – мясцовыя ўрады на чале з маршалкамі. Дадзеная ўрадавая асоба павінна была ажыццяўляць кіраванне павятовай шляхтай, склікаць і праводзіць сеймікі, займацца развіццём эканамічнай і сацыяльнай сфер. Маршалкам слонімскім у XVI ст. з’яўляўся Марцін Тышкевіч, шляхту Барысаўскага павета ў 1814–1820 гг. узначальваў Пій Тышкевіч, а пазней – Яўстафій Тышкевіч. В. Каратынскі адзначаў, што Яўстафій быў адзіным маршалкам, які займаўся даследаваннем фальклору, і шкадуе, што іншыя кіраўнікі шляхты не падтрымалі пачын графа. Маршалкамі Барысаўскага павета было шмат зроблена для развіцця прамысловасці і сацыякультурнай сферы. Вядомы даследчык і краязнаўца П. Шпілеўскі адзначаў, што мястэчковыя дамы Лагойска былі даволі прыгожай архітэктуры [5]. Існавала фабрыка баваўняных і льняных вырабаў, для якой сыравіну выпісвалі з Англіі. Маршалак Пій разам з сынам Канстанцінам актыўна займаліся гаспадарчымі рэформамі, абапіраючыся на тэарэтычныя веды і вопыт, з якімі Яўстафій пазнаёміўся ў краінах Заходняй Еўропы, дзе пабываў па службовых справах. На фабрыку льняных і баваўняных тканін запрашаліся спецыялісты з Германіі, якія вучылі мясцовых рабочых выраблаць якасную тканіну. Лагойскія маршалкі адкрылі ліцейную вытворчасць і тым самым забяспечвалі мясцовае насельніцтва неабходнымі ў гаспадарцы жалезнымі прадметамі [6].

На іх сродкі ў Валожыне і Лагойску створаны шэраг архітэктурных помнікаў. Так, граф Юзаф Тышкевіч у 1806 г. замовіў архітэктару А. Касакоўскаму стварыць на ўзвышаным беразе ракі Валожынка палацава-паркавы ансамбль у стылі класіцызму. Комплекс складаўся з мураванага палаца, бакавых флігеляў і рэгулярнага парка, які спускаўся да ракі. У гэтым жа горадзе на сродкі графа Юзафа ў 1816 г. узведзены мураваны касцёл у стылі класіцызму. Палац і касцёл захаваліся да нашага часу і ўваходзяць у скарбонку нацыянальнай культуры. У 1814–1819 гг. уладальнікі Лагойска ўзвялі двухпавярховы палац у італьянскім стылі, ад якога ўздоўж ракі Гайны не на адну сотню метраў раскінуўся дзівосны парк. Там раслі такія экзатычныя дрэвы, як белая таполя, пенсільванскі ясень, сібірская лістоўніца, серабрысты клён, залацістая ліпа і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Увогуле ў парку налічвалася каля трохсот назваў раслін. Пры планіроўцы былі ўлічаны замкавыя ўмацаванні, равы (раней яны былі глыбінёй 4–5 м) і валы. У крыштальна чыстай вадзе вадзілася фарэль. У парку зроблены фантан з круглым вадаёмам. Акрамя таго, была настолькі велізарная колькасць крыніц, што ў сярэдзіне XIX ст. на левым беразе Гайны (насупраць касцёла) пабудавалі лячэбніцу, дзе лекаваліся ад рэўматызму, нервовых захворванняў, коклюша і інш. [4, с. 181–183]. Сёння засталіся толькі рэшткі ад парку Тышкевічаў, захаваліся асобныя экзатычныя дрэвы. Сумная сітуацыя склалася і з палацам Тышкевічаў. У даваенны перыяд ён служыў адміністрацыйным будынкам горада. У савецкі час у падвалах палаца знаходзілася камера папярэдняга затрымання, а з прыходам немцаў была ўтворана турма. На жаль, палац згарэў падчас Другой сусветнай вайны [7, с. 175].

З графскага роду Тышкевічаў вылучыліся не толькі знакамітыя дзяржаўныя, палітычныя і грамадскія дзеячы Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі, але і славутыя военачальнікі. Так, Феліцыян у XVIII ст. быў генерал-маёрам, а Антоні Казімір – генерал-лейтэнантам у войску Вялікага Княства Літоўскага, Міхал камандаваў 17-м кавалерыйскім палком войска ВКЛ у 1812–1814 гг., Юзэф, якому належалі маёнткі ў Крэтынгу, Ландвараве і Паланзе (Літва), служыў капітанам у расійскай арміі.

Графская лінія Тышкевічаў дала не толькі нашай Бацькаўшчыне, але і іншым краінам шэраг славутых даследчыкаў матэрыяльнай і духоўнай культуры, дзеячаў мастацтва. Рэзідэнцыі Тышкевічаў Валожын і Лагойск на працягу стагоддзяў былі цэнтрамі музычна-тэатральнага мастацтва. Граф Пій Феліцыянавіч цудоўна граў на скрыпцы і флейце, часта арганізоўваў у сваім палацы камерныя і сольныя канцэрты, быў выдатным рэзчыкам па дрэве і інкрустатарам. Граф сябраваў з вядомым кампазітарам XIX ст. Восіпам Казлоўскім, кампазітарам і піяністам Фларыянам Міладоўскім. У палацы заўсёды гучала музыка Гайдна і Моцарта. Частым госцем у Лагойску быў і такі слынны мастак і музыка, як Напалеон Орда, які, дарэчы, пакінуў замалёўку палаца Тышкевічаў. Слынным кампазітарам, вядомым у еўрапейскіх музыкаў, з’яўляўся Ян Тышкевіч. Міхал

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Казімір у першым шлюбе быў жанаты са знакамітай у 1930-я гг. актрысай і спявачкай Марыяй Анкай Петрусінскай (псеўданім Ганка Ордан). Іх нашчадкі з Валожына цяпер жывуць у Лондане і Бруселі.

Графы з Лагойска грунтоўна займаліся і фальклорам. Пій Фларыянавіч, Канстанцін і Яўстафій, пераапрануўшыся ў простае сялянскае адзенне, хадзілі па вясковых хатах, корчмах, каб паслухаць і запісаць народныя песні, легенды, паданні, шчырую гутарку сялян пра побыт, паўдзельнічаць у абрадах [2]. Фальклорны, этнаграфічны і археалагічны матэрыял, сабраны падчас экспедыцыі па рацэ Віліі, стаў асновай кнігі «Вілія і яе берагі», апублікаванай у Дрэздэне ў 1871 г. У манаграфіі маюцца 23 эпізоды, дзе апісаны народныя ігрышчы з прыпеўкамі, народнымі танцамі, гульнямі, тэатралізаванымі дзеямі [8]. Яна была адзінай у Еўропе манаграфіяй, дзе фальклор этнічнага рэгіёна даследаваны шляхам падарожжа па рацэ. Кніга аздоблена графічнымі малюнкамі Артура Бартэльса, якія ён выконваў з натуры ў час сумеснага падарожжа па Віліі, што робіць манаграфію больш каштоўнай. Змешчаны апісанні многіх вясельных абрадаў, святочных рытуалаў Дзядоў, Калядаў, Радуніцы, Спаса і ўсяго святочнага цыкла гаспадарчага гадавога календара беларусаў [1].

Значная колькасць этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў, сабраных падчас падарожжа па Віліі, знойдзеных пры раскопках археалагічных помнікаў разам з хатняй калекцыяй Тышкевічаў, стала асновай першага ў Беларусі гісторыка-археалагічнага музея, які размясціўся ў іх радавым маёнтку ў Лагойску. Сучаснікі адзначалі, што ўсё ў музеі «каталагізавана і знаходзіцца ва ўзорным парадку» [4, с. 34]. Такі стан музея тлумачыцца вывучэннем графам Канстанцінам музейнай справы ў Даніі, Швецыі і іншых заходнееўрапейскіх краінах. Тагачасных навукоўцаў М. Балінскага, А. Кіркора, І. Крашэўскага ўражвалі разнастайнасць і багацце лагойскай музейнай экспазіцыі. Сапраўды, толькі ў нумізматычнай калекцыі Тышкевічаў налічвалася 1140 медалёў і манет. Сярод 3000 кніг, сабраных у бібліятэцы музея, было каля 500 старажытных помнікаў айчыннага кнігадрукавання, 1060 старажытных грамат [3, с. 6]. У музеі захоўваліся зброя, вырабы старадаўняй разьбы, цудоў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ная калекцыя ручнікоў, сурвэтак, абрусаў. Значнае месца ў зборы займалі партрэты дванаццаці пакаленняў лагойскага роду Тышкевічаў, этрускія вазы і іншыя прадметы з раскопак у Пампеі і Геркулануме, Егіпце, артэфакты з Рыма, Фларэнцыі, Неапаля і інш. Музей у Лагойску быў даступны ўсім жадаючым незалежна ад сацыяльнага становішча. Змест экспазіцыі садзейнічаў сцвярджэнню ў наведвальнікаў важнай думкі пра нацыянальную самабытнасць і гістарычную непаўторнасць Беларусі і тым самым неўсвядомлена рыхтаваў глебу для беларускага нацыянальна-вызваленчага руху.

Лагойскі музей у сярэдзіне XIX ст. стаў асновай Віленскага музея старажытнасцей. Тышкевічы ахвяравалі музею сваю бібліятэку і археалагічную калекцыю з 2000 адзінак. Папулярнасць музея хутка расла, аб чым сведчыла павелічэнне колькасці наведвальнікаў. Толькі ў 1856 г. яго наведала 7150 жыхароў Вільні і гасцей з іншых гарадоў. У наступныя гады музей кожны месяц наведвалі каля 1000 чалавек, якім давалі каментарыі і адказвалі на пытанні супрацоўнікі. Навуковая дзейнасць музея набыла даволі шырокі водгук. Яна стала вядомай у Маскве, Кіеве, Кракаве, Адэсе і інш. Але галоўнай навуковай заслугай Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў, на наш погляд, з'яўлялася распрацоўка методыкі раскопак археалагічных помнікаў. Яны сфармулявалі асноўныя правілы іх даследавання. У фундаментальных працах Канстанціна «О курганах в Литве и Западной Руси» і «Исторические сведения о замках, городищах и курганах в Литве и Руси Литовской», якія былі выдадзены ў 1865 г., ён даў максімальна магчымы на той час аналіз пахавальнага інвентару і канструкцый пахавальных збудаванняў, ажыццявіў класіфікацыю курганных насыпаў [7, с. 15]. Гэтыя манументальныя працы выклікалі вялікую цікавасць у тагачасных навуковых колах. К. Тышкевіча абіраюць членам Парыжскага геаграфічнага таварыства, Этнаграфічнага таварыства Усходняй Амерыкі, Маскоўскага археалагічнага таварыства.

Плённай была праца братоў Тышкевічаў па вывучэнні культуры і гісторыі Лагойшчыны, Астрашыцкага Гарадка, Барысаўскага павета, Заслаўя, іх старадаўняга будаўніцтва. З-пад пяра Я. Тышкевіча выйшла краязнаўчая навуковая праца «Апі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

санне Барысаўскага павета» [6], у якой ён разглядае ўсе аспекты жыцця краю: геаграфічныя ўмовы, гістарычнае мінулае, помнікі гісторыі, прыводзіць статыстычныя звесткі, даныя пра гаспадарчую і прамысловую дзейнасць. Багаты матэрыял прысвечаны этнаграфіі, фальклору і лінгвістыцы: сабраны легенды, песні, прыказкі, апісваюцца звычаі, моўныя асаблівасці, адзенне мясцовых жыхароў.

Гэтымі і іншымі навуковымі працамі Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў пакладзены пачатак шэрагу айчынных навук: археалогіі, музеялогіі, краязнаўства, нумізматыкі, фалерыстыкі і інш. Іх навуковая дзейнасць высока ацэнена сусветнай супольнасцю. Канстанцін і Яўстафій з'яўляліся ганаровымі членамі шматлікіх навукова-даследчых устаноў, у т. л. Пецярбургскай і Стакгольмскай акадэмій навук, Лонданскага археалагічнага інстытута, Дацкага каралеўскага таварыства аматараў паўночных старажытнасцей. Іх працы выдаваліся ў Берліне, Кракаве і Вільні. Удзячнасцю і прызнаннем заслуг Пія Фларыянавіча ў навуцы было абранне яго ў 1856 г., у 100-гадовым узросце, ганаровым членам Віленскай археалагічнай камісіі.

Такім чынам, род графаў Тышкевічаў прайшоў працяглую гістарычную эвалюцыю, а яго нашчадкі ў другой палове XX ст. увайшлі ў склад інтэлігенцыі розных краін свету: Літвы, Польшчы, Францыі, Англіі, ЗША, Канады.

1. *Вялейка, Я.* Экспедыцыя: Вілія – Нярыс / Я. Вялейка // Волат. – 2007. – № 18.

2. *Каратынскі, В.* Яўстафій Тышкевіч / В. Каратынскі // Творы ; пер. з польск, уклад., прадм. і камент. У. Мархель ; маст. М. Купава. – Мінск, 1981. – С. 126–141.

3. Перечневый каталог предметов в Виленском музее древностей / сост. дейст. чл. А. Киркор. – Вильно : Тип. Осипа Завадского, 1858. – 20 с.

4. *Федорук, А. Т.* Старинные усадьбы Минского края / А. Т. Федорук. – Минск : Полифак, 2000. – 415 с.

5. *Шпилевский, П. М.* Путешествие по Полесью и белорусскому краю / П. М. Шпилевский. – Минск : Беларусь, 2004. – 250 с.

6. *Tyszkiewicz, Hr. Eustachy.* Opisanie powiatu Borysowskiego pod wxgedem statystycznym, gospodarczym, hremyslowo-handlowym i lekarskim: z dod wiadom.: o obyczajach, spiewach, przyslowiach i uborach

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ludu, guslach, zabobonach i t. d. / E. Tyszkiewicz. – Wilno : Drukarnia Ant. Marcinowskiego, 1847. – 489, IV s.

*7.* O kurhanach na Litwie i Rusi Zachodniej / stadium archeok. przez Konstantego hrebaiego Tyszkiewicza, czlonka wielu uczonych t-w. – Berlin : [s. n.], 1868. – 287 s.

*8. Tyszkiewicz, Hr.* Konstanty Wilija i jej brzegi / Hr. Konstanty. Tyszkiewicz. – Vilnius : Liedykla Atkula, 2008. – 362 с.

Ю. И. КНАТЬКО

## БЕНЕДИКТ ТЫШКЕВИЧ И СТАНОВЛЕНИЕ БЕЛОРУССКОГО ФОТОИСКУССТВА

«Подлинная тайна мира – это видимое, а не невидимое»
*Оскар Уайльд*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бенедикт Хенрик Тышкевич (11 декабря 1852 – 13 мая 1935) – коллекционер и меценат, путешественник и интрапренер, основатель белорусского фотоискусства. Потомок известного аристократического рода родился в Виленском уезде (местечко Немеж), провел детство в имении в Раудондварисе (Красный двор, недалеко от г. Каунас, Литва), некоторое время вместе с женой Эльжбетой Кларой Банкрофт жил во Франции в усадьбе в Нёи-сюр-Сен, в 1880-х гг. вернулся в Беларусь, поселившись в фамильном имении Вялово в Воложинском районе Минской области.

Широкий интеллектуальный диапазон, стремление к открытиям и особое, интуитивное, творческое восприятие действительности Бенедикта Тышкевича способствовали созданию новаторских по своему содержанию и характеру произведений фотографического искусства второй половины XIX – первой трети XX вв.

Творческий поиск в области фотоискусства Б. Тышкевича начался еще в раннем детстве, в огромной библиотеке его деда Бенедикта Эммануила Тышкевича в имении в Раудондварисе. Изучая географию, будущий фотохудожник обращал особое внимание на зарисовки в книгах. Его интересовало буквально все: особенности внешности людей и их гардероба, предметы